*М.А. МІХАЙЛЕЦ*

# ВЫВУЧЭННЕ НАРОДНАГА АДЗЕННЯ БЕЛАРУСАЎ ПОЛЬСКІМІ ЭТНОГРАФАМІ XIX – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX ст.

Анализируются работы польских этнографов, посвященные материальной культуре белорусов. Выделяются три основные этапа изучения традиционного белорусского костюма польскими этнографами.

The works of the Polish ethnographers devoted to the Belarusian material culture are analysed in this article. It concludes that there are three basic stages of studying the Belarusian traditional costume by the Polish ethnographers.

Польскамоўныя крыніцы па этнаграфіі Беларусі да гэтага часу не выкарыстоўваюцца ў поўным аб'ёме ў беларускай этнаграфічнай навуцы, нягледзячы на наяўнасць у іх цікавай і карыснай інфармацыі па розных аспектах традыцыйнай культуры Беларусі, у тым ліку і па адзенню. Таму лічым неабходным правесці іх далейшы ўсебаковы аналіз.

Звесткі па народнаму адзенню беларусаў у польскіх даследчыкаў сустракаюцца ўжо на першым этапе развіцця польскай этнаграфіі, калі яна яшчэ ўваходзіла ў склад гістарычнай навукі і толькі пачынаўся працэс яе аўтанамізацыі. У першай палове XIX ст. большая частка намаганняў даследчыкаў была накіравана на збор крыніц. Гэтая дзейнасць не мела арганізацыйных рамак і характарызавалася аматарскімі ініцыятывамі, пазбаўленымі глыбокай тэарэтычнай рэфлексіі[1].

У часопісе “Tygodnik Wilenski” ў 1819 г. з'явіўся артыкул Ігната Шыдлоўскага “Вясельныя абрады сялян у Барысаўскім павеце Мінскай губерні...”[2] (тут і далей – пераклад аўтара), дзе сустракаюцца звесткі па некаторых элементах матэрыяльнай культуры, у тым ліку па адзенню. У прыватнасці, І. Шыдлоўскі піша, што падчас вяселля маладая раздавала паяскі. Паясок, які называлі “ўснова”, ткалі з белых ніцей, а “ўток” – з каляровых, пераважна чырвоных[3].

У 1830 г. у Варшаве з друку выйшла некалькі работ Лукаша Галамбёўскага (1773–1849), прысвечаных этнаграфіі зямель былой Рэчы Паспалітай, у якіх аўтар закранае і пытанні этнаграфіі беларусаў[4], але не лічыць беларусаў самастойным этнасам: “Нашу зямлю насяляюць тры віды сялян – польскі селянін, рускі і літоўскі”[5].

Л. Галамбёўскі надае матэрыяльнай культуры мала ўвагі, прыводзіць яе кароткі нарыс, як бы ўводзіны ў культуру духоўную. У той жа час аўтар не хоча абмяжоўвацца толькі простым апісаннем традыцыйнай культуры, а лічыць, што даследчык павінен рабіць і тэарэтычныя высновы: “Трэба не толькі задавальненне першай патрэбы мець на ўвазе, але ў падрабязным апісанні спосаба жыцця знаходзіць падабенствы і розніцы з суседнімі ці больш далёкімі краінамі, даследаваць прычыны...”[6] Ён піша пра сярмягі з даматканай тканіны шэрага колеру, а ў святочныя дні чорнага; пра лапці; пра шапкі з шэрай аўчыны з сінім, а ў дзяцей з пунсовым суконным верхам. Ёсць у яго апісанне жаночых галаўных убораў: «Дзяўчаты носяць хусткі белыя ці каляровыя і валасы, заплеценыя ў касу, звісаючыя. Замужнія жанчыны, павязаўшы спачатку паркалёвую хустку, невялікую, з выпушчанымі канцамі, абвязваюць галаву рознымі спосабамі намёткай вузкай з кужэльнага палатна, на святы – з тканага галандскага ці паркалю, канцы вышываюць “*гарынам*” (пурпурова-чырвоным колерам)»[7].

На амаль што пяцістах старонках даследавання Яўстафія Тышкевіча “Апісанне Барысаўскага павета”, якое выйшла ў Вільні ў 1847 г., падрабязна апісана флора і фауна, гаспадарка, архітэктура Барысава і бліжэйшых мястэчак, заняткі, звычаі і абрады жыхароў і шмат чаго іншага. Я. Тышкевіч у прадмове так вызначае мэту сваёй працы: “Усе асвечаныя народы ў наш час прыкладаюць намаганні, каб, разумеючы мэту саюзу людзей, злучаных у адно цела, сабраць і апісаць усё, што статыстыка агарнуць павінна, для дакладнага разумення палітычнай асновы свайго краю, а адтуль і карысці агульнай або асобнай кожнага жыхара”[8].

Я. Тышкевіч падзяляе Барысаўскі павет на дзве часткі: лясную і палявую, а яго жыхароў – на два тыпы, якія адрозніваюцца паміж сабой, акрамя іншага, і некаторымі асаблівасцямі ў адзенні. Так, у паўночна-заходняй (лясной) частцы Барысаўскага павета ва ўжытку былі шэрыя суконныя ці палатняныя нагавіцы, там

насілі сукенную да кален світу бурага колеру. На тэрыторыі ўсяго павета была пашырана "...шэрая ці цёмная сярмяга (кафтан) з маленькім кантам замест каўняра, з вельмі моцнага сукна, простай воўны; часам бывае белаватая; пакрой мае характэрны, аднолькавы для мужчын і жанчын; не шырокая; крысо на крысо далёка не заходзіць; рэдка бывае ніжэй за калена [...] носяць яе як улетку, так і ўзімку"[9].

Падчас дажджу летам, а снегу зімой паверх сярмягі і жанчыны, і мужчыны насілі "насоў" і кажух без пояса. Летнія нагавіцы былі з палатна, а зімнія – з сукна, на "ўчкурні" (сцягнутыя пастаронкам). Больш заможныя жанчыны насілі шарсцяны каляровы андарак, бяднейшыя – палатняную спадніцу і фартух паверх яе[10].

Паміж першым і другім этапамі развіцця польскай этнаграфіі постаць Оскара Кольберга (1814–1890) з'яўляецца пераходнай. Яго навуковая дзейнасць была накіравана, перш за ўсё, на збіранне фальклорных матэрыялаў. Пачаўшы з народных песень, у далейшым ён значна пашырыў кола сваіх навуковых інтарэсаў. Задуманая ім шматтомная работа "Народ..." увогуле не мела да той пары прэцэдэнтаў у сусветнай навуцы. Пры жыцці ён выпусціў 33 тамы "Народу...", прысвечаныя розным рэгіёнам Польшчы. Том пра Беларусь быў выдадзены ў 1968 г. (падрыхтоўку матэрыялаў да выдання астатніх з васьмідзесяці тамоў ажыццяўляў калектыў з 50 чалавек) на падставе архіўных папак № 28 і 29. Сам О. Кольберг наведаў Беларусь толькі аднойчы, у 1831 г., і, відаць, ніякіх запісаў у той час не зрабіў. У. Васілевіч лічыць, што "...верагодней за ўсё запісы рабіліся О. Кольбергам ад беларусаў-перасяленцаў не напачатку, а калі ў збіральніка ўзнікла жаданне ўслед за цэнтральнымі раёнамі Польшчы манаграфічна прадставіць і яе ўскраіны. (Да самастойных Кольбергавых запісаў з тэрыторыі сучаснай адміністратыўнай Беларусі звычайна далучаюць толькі тыя, што былі зроблены на Брэсцкім Палессі.)"[11] Асноўную частку беларускіх матэрыялаў у даследаванні О. Кольберга складаюць выпіскі з работ Л. Галамбёўскага, Я. Тышкевіча, Ю.І. Крашэўскага, П. Бабpоўскага, Э. Ажэшкі і інш. Сам О. Кольберг планаваў апублікаваць гэтыя матэрыялы пад назвай "Чорная Русь, Літоўская, Палессе і Беларусь". Яго работа падзелена на некалькі раздзелаў: "Край", "Народ", "Звычаі", "Абрады, песні", "Апавяданні, байкі, прымаўкі", "Гульні і забабоны", "Мова". Пераважную большасць даследавання займае апісанне духоўнай культуры, вуснай народнай творчасці.

О. Кольберг піша, што "...у паўночнай старане беларусы і чорнарусы верхнюю вопратку маюць з шэрага сукна, світка са звычайнага даматканага сукна з невялікім пастаўленым каўняром [...] Пояс суконны, блакітны або сіні, зялёны ці чырвоны, шырокі на тры вяршкі (13,32 см)"[12]. Адзначаныя матэрыялы змяшчаюць звесткі аб мужчынскіх і жаночых галаўных уборах, каліце, спадніцы, гарсэце.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. у польскай этнаграфіі стаў вядучым эвалюцыянізм і былі сфармуляваны важныя палажэнні, сярод якіх прызнанне крыніцай старажытных перажыткаў і неабходнасць вывучэння сялянства як групы з малой дынамікай развіцця[13]. У гэты час з'яўляюцца працы Э. Яленскай[14], З. Глогера[15] і П. Талька-Грынцэвіча[16]. У той жа час большасць аўтараў артыкулаў працягвае папярэднюю традыцыю, іх работы вызначаюцца аматарскім характарам і галоўнай мэтай маюць збор крыніц.

У лепшых традыцыях пазітывізму напісана работа Эмы Яленскай-Дмахоўскай (1864–1919) "Вёска Камаровічы ў Мазырскім павеце", якая можа і сёння паслужыць прыкладам краязнаўчага даследавання. Вёска Камаровічы, што знаходзілася за 35 вёрст (каля 37,5 км) ад бліжэйшай чыгуначнай станцыі (а незадоўга перад тым – за ўсе 130 (каля 138,5 км)), сапраўды ўяўляла цікавасць як для фалькларыста, так і для этнографа. Даследчыца не толькі сабрала матэрыял па абрадах, святах, вераваннях палешукоў, але і шматгранна апісала матэрыяльную культуру, уключаючы гаспадарчыя заняткі, народнае дойлідства, адзенне.

Э. Яленская даволі падрабязна апісвае кашулю, адзначаючы асаблівасці жаночай кашулі; камізэльку, якую апранaлі на кашулю, "...з глыбокім выразам ля шыі, ззаду палатняную, а спераду з даматканай шарсцяной тканіны, чырвонай у краты або ў палосы з чорным, зялёным або жоўтым"[17]. Яна застала яшчэ аблавуху: «Сустракаюцца яшчэ шапкі, пашытыя ў хаце, белыя, уверсе чатырохвугольныя,

па швах аздобленыя сінім шнурам, з адваротам з меха, які можна спусціць на вушы і завязаць пад барадой. Шапкі такія называюцца "*аблаухы*" і носяць іх толькі вельмі старыя»[18].

Даследчыца дае падрабязнае апісанне жаночай спадніцы, фартуха і гарсэта: «Спадніца доўгая да зямлі, гафрыраваная каля пояса і заўсёды звязаная тканым пояском, канцы якога вісяць збоку. Спадніца заўсёды з шарсцянога матэрыялу, чырвонага ў клетку або ў чорныя, сінія ці зялёныя палоскі; тканіна гэта называецца "*андаракі*" і робяць яе дома. Летам часта відаць спадніцы паркалёвыя, звычайна чырвоныя. На працу апранаюць таксама больш лёгкія і танныя, з ільняной бела-блакітнай тканіны, якую называюць "*летнікам*". Фартухі на будні дзень у іх палатняныя, вышытыя ўнізе чырвоным; на святы апранаюць белыя, паркалёвыя, купленыя ў яўрэяў, з нашыўкамі або з вязанай устаўкай. За такі фартух, агідна пашыты, плацяць па пяць грошай і болей. Гарсэты часцей за ўсё цёмныя, суконныя, чорныя, цёмна-сінія, часта нават чорныя аксамітныя. На святы маладыя жанчыны апранаюць чырвоныя паркалёвыя, у кветкі жоўтыя і зялёныя. Такі гарсэт без рукавоў, з глыбокім выразам ля шыі, зашпільваецца на бліскучыя гузікі; калі гладка прылягае, дасканала падкрэслівае формы»[19].

Трэці перыяд гісторыі польскай этнаграфіі паміж сусветнымі войнамі характарызуецца з'яўленнем новых арыентацый: антрапагеаграфія, культурна-гістарычная школа, сацыялагічны накірунак. З польскіх даследчыкаў гэтага часу, якія займаліся вывучэннем традыцыйнай культуры беларусаў, вылучаецца імя Казіміра Машынскага (1887–1959). К. Машынскі працягваў распрацоўваць эвалюцыйны метад у этналогіі, удасканаліў яго, у выніку чаго з'явіўся яго ўласны метад – крытычны эвалюцыянізм. Ён напісаў некалькі работ, прысвечаных традыцыйнай культуры Беларусі, сярод якіх вылучаецца сваёй грунтоўнасцю "Усходняе Палессе"[20], па матэрыялах палявых этнаграфічных даследаванняў, якія аўтар праводзіў у чэрвені 1914 г. у Мазырскім і Рэчыцкім паветах. Шмат інфармацыі К. Машынскі атрымаў ад Чэслава Пяткевіча, які знаёміў яго з мясцовымі аколіцамі.

Даследаванне К. Машынскага адрознівае строга пабудаваная структура, якая ўключае ўводзіны, дзе гаворка ідзе аб фізіка-геаграфічным апісанні Мазырскага і Рэчыцкага паветаў; першую частку – "Матэрыяльная культура" і другую – "Духоўная і грамадская культура". У сваю чаргу, першая частка падзяляецца на падраздзелы: 1. Клопат аб пракармленні; 2. Гатаванне страў; 3. Вытворчасць прылад і прыстасаванняў, адзення і будынкаў; 4. Падарожжы і дарогі. Як адзначае сам аўтар, работа не з'яўляецца поўнай, таму што працу даследчыка на Палессі перапыніла Першая сусветная вайна.

К. Машынскі падрабязна апісвае працэс пляцення лапцей, мужчынскую кашулю, світу, "*казачыну*" – святочную світу са складкамі ззаду. У наваколлі Выраў і Чабля на Палессі ён сустракаў асаблівыя "радзюхоны" з кароткімі рукавамі. «Штаны пашыты з сукна ці тоўстага канаплянага палатна такім чынам, што, калі сядзіш, яны моцна абвісаюць і ўтвараюць так званае "*крэсло*". Падпяразваюцца штаны тоўстай вяроўкай альбо раменьчыкам ("*учкур*"), які прапускаецца праз утулку з закручанага верхняга краю штаноў»[21]. Даследчык прыводзіць таксама малюнак шапкі, абшытай аўчынай, піша пра шапку-рагатку.

Падрабязна апісаны К. Машынскім комплекс жаночага адзення, у прыватнасці андарак: «Пасля кашулі самай важнай часткай адзення рэчыцкай жанчыны з'яўляецца спадніца ("*андарак*" або "*андэрак*") з даматканага шарсцянога сукна, вытканага ў вялікую або дробную шахматную дошку, чорную з чырвоным. Падобныя шарсцяныя і каляровыя андаракі носяць таксама ў Мазырскім павеце, дзе пры гэтым вельмі распаўсюдзілася купля матэрыялаў з больш яркімі і стракатымі ўзорамі. У Тураве мне апавядалі, што ў Альнянах (Бярозаўская воласць) жанчыны яшчэ носяць замест спадніцы дзве полкі [...] Паверх спадніцы падпяразваюцца часам доўгім чырвоным поясам (Тураў), а ў будні дзень падгінаюць яе звычайна да кален і засоўваюць за пояс. Носяць таксама фартухі, а ў Рэчыцкім павеце хаджэнне без гэтай часткі адзення ("*хвартух*") лічыцца нават непрыстойным. Вельмі цікава, што спадніцу альбо фартух, калі іх трымаюць перад сабой і збіраюць у іх, напрыклад, жалуды ці грыбы, называюць "*пелена*"»[22]. Ёсць у К. Машынскага паведамленні і пра жаночыя галаўныя ўборы, у прыватнасці пра намітку.

Найбольш падрабязна польскімі этнографамі К. Машынскім і Э. Яленскай было даследавана сялянскае адзенне Палесся і Я. Тышкевічам – Барысаўскага павета. У навуковых працах польскіх этнографаў XIX – першай паловы XX ст. змешчана інфармацыя пра ўсе элементы традыцыйнага касцюма беларусаў.

[1] Гл.: Pozern-Zielicński A. Etnografia jako samodzielna dyscyplina naukowa // Historia etnografii polskiej. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1973. C. 50–51; Sokolewicz Z. Szkoły i kierunki w etnografii polskiej // Ibid. C. 120.

[2] Гл.: Obrzędy weselne ludu wiejskiego w gub. Mińskiej, w powiecie Borysowskim, w parafii Hajeńskiej, obserwowane w latach 1800, 1-m i 2-m z niektóremi piosenkami i ich zwyczajną notą // Tygodnik Wileński. 1819. T. 7. C. 1–18, 81–104.

[3] Гл.: Ibid. C. 94–95.

[4] Гл.: Gołębiowski Ł. Domy i dwory. Warszawa, 1830; Lud Polski. Warszawa, 1830; Ubiory w Polszcze. Warszawa, 1830.

[5] Ён жа. Lud Polski. C. 1.

[6] Ён жа. Domy i dwory. C. 28–29.

[7] Ён жа. Lud Polski. C. 51–52.

[8] Opisanie powiatu Borysowskiego. Wilno, 1847.

[9] Ibid. C. 116.

[10] Гл.: Ibid. C. 118.

[11] Васілевіч У.А. Збіральнікі. Мн., 1985. С. 13.

[12] Kolberg O. Dziela wszystkie. T. 52. Białoruś – Polesie. Warszawa, 1968. C. 53.

[13] Гл.: Sokolewicz Z. Op. cit. C. 139.

[14] Гл.: Jeleńska E. Wieś Komarowicze. Warszawa, 1892.

[15] Гл.: Gloger Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana. Wyd. 4. Warszawa, 1972; Zwyczaje ludu z okolic Tykocina i Bielska // Biblioteka Warszawska. 1868. T. 1. C. 141–147.

[16] Гл.: Talko-Hryncewicz P. Człowiek na ziemiach naszych. Warszawa, 1913.

[17] Jeleńska E. Op. cit. C. 30.

[18] Ibid. C. 30–31.

[19] Ibid. C. 31.

[20] Гл.: Moszyński K. Polesie Wschodnie. Warszawa, 1928.

[21] Ibid. C. 100.

[22] Ibid. C. 100–101.

Паступіў у рэдакцыю 11.03.2003.

*Міхаіл Анатольевіч Міхайлец* – аспірант кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт Т.А. Навагродскі.

*Е.А. ГРЕБЕНЬ*

## ПЕРЕМЕЩЕНИЕ НЕМЕЦКИМИ ОККУПАНТАМИ ТРУДОСПОСОБНОГО НАСЕЛЕНИЯ БЕЛАРУСИ ВО ВРЕМЯ ОТСТУПЛЕНИЯ (1943–1944)

Рассматривается актуальная в белорусской историографии проблема перемещения трудоспособного населения Беларуси немецкими оккупационными властями в 1943–1944 гг. На основе архивных источников приведены статистические данные, изучены причины принудительного перемещения, проанализирована его специфика.

The topical problem in the Belarusian historiography which is connected with the displacing of the able-bodied population of Belarus by the German occupation authorities in 1943–1944 is considered in the article. The reasons of compulsory moving are studied on the basis of archive sources and its specific character in different periods of the Great Patriotic war is analysed. Statistical data that describe the problem are also given here.

Советские войска с 1942 г. начали приближаться к территории Беларуси. Освобождение оккупированных территорий Советского Союза происходило медленно, но неуклонно, и этого факта немецкие оккупационные власти не могли не осознавать. В результате встал вопрос о вывозе на Запад материальных ценностей и людских ресурсов. В 1943–1944 гг. развернулась настоящая борьба за трудоспособное население, которое оккупационные власти начали принудительно перемещать в западные районы Беларуси и далее в Германию. Во-первых, по-прежнему актуальным оставалось обеспечение экономики рабочими руками